УДК 61:615.1(043.2)
ББК 5:52.82
ISBN 978-985-21-0251-3



*Астражынскі Я. А.*

**АДРАДЖЭННЕ РЫМСКА-КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА Ў БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ 1980-Х – 1990-Х ГГ.**

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Лубінскі І. І.***
*Кафедра філасофіі і паліталогіі*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт, г. Мінск*

**Актуальнасць.** Адраджэнне каталіцтва на тэрыторыі Беларусі ў 1980-я – 1990-я гг. яшчэ не да канца вывучана і патрабуе далейшага даследвання, а Каталіцкі Касцёл працягвае адыгрываць і сёння важную ролю ў развіцці грамадства Беларусі.

**Мэта:** даследваць адраджэнне і функцыяванне Рымска-Каталіцкага Касцёла ў перыяд з 1980-х па 1990-я гады ў Беларусі, вызначыць гістарычную абумоўленасць адраджэння каталіцызму ў Беларусі.

**Матэрыялы і метады.** Матэрыялы: дакументы Каталіцкага Касцёла, навуковыя даследванні па тэме, інтэрв'ю са сведкамі падзей. Метады: аналіз, сінтэз, дэдукцыя, індукцыя, сістэмны аналіз.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У канцы 1980-х і на працягу 1990-х гг. пасля шматгадовай антырэлігійнай палітыкі адбываецца ажыўленне дзейнасці Рымска-Каталіцкага Касцёла і складваецца сучасная структура каталіцтва ў Беларусі. у 1989 годзе паміж урадамі СССР і Польскай Народнай Рэспублікі быў заключаны дагавор, у адпаведнасці з якім у Беларусь запрашаліся 50 ксяндзоў - палякаў для працы на духоўнай ніве. У перыяд 1993 – 1995 гг. яшчэ 40 святароў прыбылі на Беларусь з Польшчы па прыватным запрашэнням ад беларускіх вернікаў. З 1987 па 1989 гг. быў зарэгістраваны 51 касцёл, стаяла пытанне аб адкрыцці яшчэ 21 святыні. Разам з тым на 162 існуючых парафіі прыпадала толькі 62 святары. Адзін ксёндз абслугоўваў тры і больш парафій. Часам за дзень яму даводзілася праязджаць па 200 і больш кіламетраў, каб задаволіць рэлігійныя патрэбы ўсіх вернікаў. У 1991-1999 гг. было створана 4 дыяцэзіі, якія падзяляліся на 31 дэканат. На 1 снежня 2000 года на Беларусі налічвалася 405 каталіцкіх парафій, 266 святароў, 7 кляштараў, 5 добраахвотных каталіцкіх суполак. У навучальным 1997/1998 годзе ў Гродненскім катэхічным інстытуце працаваў 21 выкладчык і налічвалася 85 студэнтаў, асноўная частка якіх была з Гродзенскай дыяцэзіі. У тым жа навучальным годзе ў катэхічным каледжы ў Баранавічах працавала 13 выкладчыкаў і налічвалася 76 навучэнцаў, якія праходзілі навучэнне на працягу трох гадоў. 17 чэрвеня 1995 года ўпершыню ў гісторыі Вышэйшай духоўнай семінарыі ў Гродна адбылося пасвячэнне ў сан святара. У 1994 пачалі выдавацца каталіцкія часопісы «Дыялог» і «Ave Maria». Касцельныя хоры, тэатральныя пастаноўкі, канцэрты, мастацкія выставы, школа арганістаў, вячары арганнай музыкі, каталіцкае кіно, фестывалі, касцёльная бібліятэка імя Адама Міцкевіча, якая налічвае каля 60 000 кніг і 4 000 сталых падпісчыкаў, каталіцкае радые і тэлепраграма, якія транслііруюцца на ўсю краіну, і шмат чаго іншага ўзнікла дзякуючы энэргіі, намаганням невялікай групы каталікоў, а асабліва адной асобы – ксяндза-магістра Уладзіслава Завальнюка.

**Высновы.** У выніку рэпрэсій савецкіх уладаў Рымска-Каталіцкі Касцёл ў Беларусі меў значныя страты сярод духавенства і маёмасці, былі знішчаны і забраны шматлікія святыні і культавыя будынкі. Працэс духоўнага і грамадскага адраджэнне каталіцызма ў канцы 1980-х - 1990-х гадах у Беларусі не з'яўляўся легкім і патрабаваў шмат часу і высілкаў. Адбылося фарміраванне ўласнай адміністрацыйнай структуры Касцёла ў межах рэспублікі, вяртанне раней страчаных святынь, складванне сеткі каталіцкіх парафій на ўсходзе Беларусі і аднаўленне там каталіцкага жыцця. Станоўчыя перамены сталі лагічным вынікам дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця.



Репозиторий БГМУ